**ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ**

# «Размаўляй са мной па-беларуску!»

Паліна ІВАНОВА, «ГВ»

**Па ініцыятыве ЮНЕСКА з 1999 года 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. З гэтай нагоды ў бібліятэках ДУ «Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля» пройдзе акцыя «Размаўляй са мной па-беларуску!»**

У цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. І. Герцэна ў гэты дзень чытачоў будуць чакаць кніжна-ілюстрацыйныя выставы, конкурсы, віктарыны і інтэрактыўныя гульні.

У бібліятэках-філіялах з гэтай нагоды 20 і 21 лютага пройдуць літаратурна-музычныя кампазіцыі, пазнавальныя гадзіны, бліц-турніры, гульні-віктарыны, а таксама будуць ладзіцца кніжна-ілюстрацыйныя выставы.